**Ю.У. Мянькоў,**
настаўнік першай катэгорыі
Баравабудскага сада-базавай школы Кармянскага раёна

# Выхаванне і навучанне праз творчасць
# Педагагічная майстэрня па творы С. Алексіевіч «Чарнобыльская малітва» (11 клас)

## Самааналіз педагагічнай майстэрні па творы Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва” ў 9 (11) класе

Урок беларускай літаратуры па творы Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва” быў распрацаваны і праведзены мною ў красавіку 2008 года. Гэты ўрок быў праведзены ў 9 класе, дзе большасць вучняў наведвалі профільную групу па беларускай мове, мелі добрыя літаратурныя здольнасці, займаліся творчасцю (пісалі вершы, апавяданні).

Педагагічная майстэрня вельмі спадабалася вучням, якія прынялі актыўны ўдзел пры падрыхтоўцы кабінета беларускай мовы і літаратуры да ўрока (падрыхтоўка газеты па творчасці пісьменніка, падрыхтоўка малюнкаў да выставы і г. д.), а таксама пры абмеркаванні пытанняў Сацыяканструкцыі і Рэфлексіі.

Пакажам аналіз урока ў форме табліцы:

| Аспект урока | Аналіз этапаў урока | Вывады |
|---|---|---|
| Матывацыйны аспект урока | Забеспячэнне матывацыйнай гатоўнасці і станоўчага эмацыянальнага настрою вучняў да работы на ўроку праз аналіз малюнкаў; вучні самастойна вызначылі адукацыйную мэту і задачы ўрока, таму адукацыйная мэта ўрока стала для вучняў асобасна значымай. Вучні працавалі для сябе, а не для кагосьці. | Настаўнік забяспечыў настрой вучняў перад урокам.<br><br>Самастойнасць вучняў пры вызначэнні мэты ўрока. |
| Змястоўны аспект урока | На ўроку прысутнічала як індывідуальная (падбор асацыятыўных радоў слоў да пэўнага паняцця, творчасць), так і групавая работа (заданні на картках) вучняў; стварэнне вучнямі адукацыйных прадуктаў (вызначэнне адукацыйнай мэты ўрока, падбор асацыяцый да паняцця, дыскусія | Дыферэнцыяцыя навучання і выхавання.<br>Рознаўзроўневы характар заданняў; самастойнасць вучняў пры абмер- |


**Ю. У. Мянькоў,** настаўнік першай катэгорыі Баравабудскага сада-базавай школы Кармянскага раёна
**Выхаванне і навучанне праз творчасць: педагагічная майстэрня па творы С. Алексіевіч «Чарнобыльская малітва» (11 клас)**
© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

| | | |
|---|---|---|
| | па пытаннях педагагічнай майстэрні; фарміраваліся і развіваліся творчыя магчымасці школьнікаў праз напісанне творчых работ (сачыненняў, вершаў) | каванні пытанняў майстэрні. Асобаснае развіццё вучняў. |
| Арганізацыйны аспект урока | Для актуалізацыі суб'ектыўнага вопыту вучняў былі выкарыстаны самыя розныя педагагічныя метады і прыёмы: індывідуальная гутарка праз пастаноўку праблемных пытанняў, дыскусія па пытаннях СА-цыяканструкцыі, "славеснае маляванне". Такім чынам ствaралася сітуацыя поспеху для кожнага вучня. Кожны вучань меў магчымасць выказаць сваю думку, мог уступіць у спрэчку, дыскусію з сябрам, таварышам па парце, развіць свае творчыя здольнасці праз напісанне творчых работ (вершы, міні-сачыненне). Пры гэтым на ўроку былі створаны ўмовы для праяўлення самастойнасці школьнікаў, што вельмі важна ў наш гістарычны час. Заданні педагагічнай майстэрні насілі рознаўзроўневы характар, што суадносіцца з патрабаваннямі 10-бальнай сістэмы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў. Дамашнім заданням таксама ўласцівы рознаўзроўневы і дыферэнцыраваны характар. Настаўнік не толькі вызначыў складанасць хатніх заданняў (тым ліку і творчага зместу), але і акрэсліў аб'ём і час выканання дамашняга задання (паведаміўшы вучням). | Дыферэнцыяцыя навучання. Цікавыя і рознаўзроўневыя заданні і пытанні.<br><br>Сітуацыя поспеху для кожнага вучня.<br><br>Самастойнасць вучняў. Развіццё творчага і лагічнага мыслення вучняў.<br><br>Рознаўзроўневы і дыферэнцыраваны характар класных і дамашніх заданняў. |
| Ацэначна-вынік. аспект урока | За ўрок былі выкананы ўсе заданні, у тым ліку і творчага характару, праведзена Рэфлексія. Урок станоўча садзейнічаў на фарміраванне станоўчай Я-канцэпцыі асобы вучня, на выпрацоўку ў дзіцяці індывідуальнага стылю пазнання свету (мыслення) | |

| | | |
|---|---|---|
| Рэфлексія ўрока | Рэфлексія “Ланцужок пажаданняў” заключалася ў тым, што ўсе ўдзельнікі педагагічнай майстэрні па чарзе звярталіся адзін да аднаго наконт урока, а таксама наконт будучых школьных спраў. | Кожны мог выказаць сваё меркаванне наконт урока. Ствараецца псіхалагічны пераход да наступнага ўрока. |

**Тэма:** Урок смутку па кнізе Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва” (Урок пазакласнага чытання ў 11 класе, 4 чвэрць, красавік / май)

**Дыдактычная мэта ўрока:** Вызначыць і ўсвядоміць значэнне Чарнобыля ў жыцці, яго ўплыў на свядомасць і мысленне беларусаў праз комплексны літаратурны аналіз кнігі Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”.

**Задачы асобаснага развіцця і выхавання:**

1. Стварыць умовы для развіцця асацыятыўнага і вобразнага мыслення, звязнага маўлення вучняў, уменняў і навыкаў асобаснага ўспрымання і разумення літаратурнага твора.
2. Стварыць умовы для выхавання ў вучняў чалавечнасці, дабрыні, міласэрнасці, спагады, беларускасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі.

**Тып урока:** Урок комплекснага літаратурнага аналізу; урок-напамін.

**Тэхналогія:** Педагагічная майстэрня.

**Працягласць урока:** 45 хвілін (адзін урок).

**Абсталяванне:** На стэндзе творы Святланы Алексіевіч, кніга “Чарнобыльская малітва”; малюнкі вучняў на тэму Чарнобыля і сучаснай Беларусі; на партах разасланыя нацыянальныя ручнікі, стаяць “Свечкі Памяці”; злева ад стэнда з кнігамі Святланы Алексіевіч – імправізаваны пастамент з буслом, вырабленым з дрэва; музычная фанаграма, магнітафон.

На перапынку і ў пачатку ўрока гучыць жалобная мелодыя.

**Эпіграф урока:**

*Я заўсёды хачу зразумець, колькі чалавека ў чалавеку? І як гэтага чалавека ў чалавеку абараніць? Чым мы можам яго абараніць?*

Святлана Алексіевіч.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант. Слова Майстра (настаўніка).**

- Ад чаго ты самотны, бусел, у гняздзе над знямелай вёскай?
- Я сумую па Беларусі, дачарнобыльскай, чыстароснай…
- Ад чаго пачарнеў ты, бусел, у палескім бары атрутным?
- Ад жалобы па Беларусі, зганьбаванай і шматпакутнай…
- Ад чаго пасівеў ты, бусел,



**Ю. У. Мянькоў,** настаўнік першай катэгорыі Баравабудскага сада-базавай школы Кармянскага раёна
**Выхаванне і навучанне праз творчасць: педагагічная майстэрня па творы С. Алексіевіч «Чарнобыльская малітва» (11 клас)**
© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

І чаму не ляціш у вырай?
- Лепш памерці на Белай Русі,
чым чужыну назваць Радзімай.

Эдуард Акулін. "Ад чаго ты самотны, бусел?.."

Светлы сімвал Беларусі – бусел. Чорны сімвал Беларусі – Чарнобыль. Падзеям чарнобыльскай трагедыі прысвечана шмат мастацкіх твораў і дакументальных кніг: "Прайсці праз зону"; аповесць-быль Івана Канановіча "Майдан", паэма Сяргея Законнікава "Чорная быль", раман Івана Шамякіна "Злая зорка", апавяданне Барыса Пятровіча "А травы там высокія"… Але сярод усіх твораў пра Чарнобыль, мусіць, асаблівае месца займае кніга Святланы Алексіевіч "Чарнобыльская малітва".

Аўтар кнігі неаднаразова пабывала ў чарнобыльскіх раёнах, на свае вочы бачыла пакуты і смерць тысячы нявінных ахвяр мірнага атама.

Перад намі гісторыі рэальна існуючых людзей, гісторыі, запісаныя крывёю сэрца. Чытаеш, а над усім гэтым нешта такое паўстае, перад чым душа ледзянее, сэрца заходзіцца ад болю і жалобы… Але ж гэта было, было… І гэта немагчыма забыць!..

*Удар гонга.*

**II. Індукцыя (Пабуджэнне да гутаркі).**

*Гукі жалобнай мелодыі ўзмацняюцца, выходзіць дзяўчына ў чорным адзенні, на плячах – чорная хусцінка жалобы.*

- Я не ведаю, пра што расказаць. Пра смерць ці пра каханне? Ці гэта адно і тое ж… Мы нядаўна пажаніліся. Яшчэ хадзілі па вуліцы і трымаліся за рукі, нават калі ў краму ішлі. Ён засынаў уначы толькі тады, як возьме мяне за руку. У яго была такая звычка – у сне мяне за руку ўсю ноч трымаць. Здавалася, нашаму шчасцю не будзе канца, здавалася, мы ніколі не расстанемся…

У тую страшную ноч іх пажарную часць выклікалі на звычайны пажар: нешта гарыць на станцыі. Як былі ў адных сарочках, так і паехалі без спецыяльных касцюмаў, у самае пекла. Тады я яшчэ не ведала, што ён паехаў назаўсёды і не вернецца да мяне…

Усю ноч я прачакала яго. Чатыры гадзіны. Пяць, шэсць. А сёмай мне перадалі, што ён у бальніцы ў цяжкім стане. Урачы чамусьці ў адзін голас паўтаралі, што пажарнікі атруціліся газамі. Трэба малако. Шмат малака. "Але ён не п'е малако? – Цяпер будзе піць, каб паправіцца!" І я еду ў бліжэйшую вёску, купляю шмат трохлітровых слоікаў з малаком, каб на ўсіх хапіла. Але ад малака іх страшэнна ванітавала. Ім станавілася ўсё горш. Раніцай, на насілках іх аднеслі ў самалёт, які адправіўся ў Маскву. Уначы сню, што ён мяне кліча… Так кліча… Падымаюся раніцай з цвёрдым намерам ехаць у Маскву. Дарогі не памятаю, усё як у тумане… У Маскве ў першага міліцыянера спытала, у якой бальніцы ляжаць чарнобыльскія пажарнікі, і ён паказаў. Клініка вострай прамянёвай хваробы – 14 дзён. За 14 дзён


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

чалавек памірае. Урачы папярэдзілі: ты сядзіш ля рэактара. Перад табой ужо не муж, не любы чалавек, а радыеактыўны аб’ект. Цалаваць нельга. Абдымаць нельга. Сядзець побач нельга. Нельга, нельга, нельга… Але як жа так, я яго так кахала?! Заходжу да яго ў палату, на століку ля яго – апельсін. Вялікі, нейкі незвычайны: не жоўты, а ружовы. Усміхаецца: “Мяне пачаставалі. Вазьмі сабе”. А медсястра махае, што нельга гэта есці. Калі ўжо ля яго нейкі час паляжаў, яго не толькі есці – дакранацца да яго страшна. “З’еш, - просіць. – Ты ж любіш апельсіны!” І я бяру апельсін у рукі… Ён у гэты час заплюшчвае вочы, засынае… Кажуць: нельга! А я гатовая ўсё зрабіць, каб толькі ён не думаў аб смерці, аб тым, што хвароба ягоная жахлівая, што я яго баюся…

Аб смерці не вельмі прыемна слухаць. Аб страшным. Але я вам распавядала пра каханне, як я кахала… [1: 5-19]

**III. Слова Майстра (настаўніка). Вызначэнне адукацыйнай мэты ўрока.**

*Настаўнік працягвае:* Чарнобыль і каханне… Здавалася б, паняцці несумяшчальныя. Але чалавек здольны супрацьпаставіць жахліваму, жудаснаму сваё простае, але сапраўднае пачуццё.

Чарнобыль. “Чорнае слова, як чорнае сонца, бязлітасна ўкацілася на беларускі небасхіл. Яно, нібы чорнае зацьменне, усё пачарніла: і зялёную траву, і празрыстую ваду, і блакітнае неба” (Янка Сіпакоў).

Самае страшнае, што людзі не вынеслі ніякіх урокаў з гісторыі, не звярнулі ўвагі на прароцтвы Іаана Багаслова, які папярэджваў: “Трэці анёл затрубіў, і ўпала з неба вялікая зорка, якая гарэла, нібы свяцільня, і ўпала на трэцюю частку рэк і на крыніцы вод. Імя гэтай зорцы – Палын; і трэцяя частка вод зрабілася палыном, і многія з людзей памерлі ад вод, таму што сталі яны горкія”.

І самае жахлівае, што прычынаю наступнай трагедыі стала не зброя, не вайна, а мірны атам.

Юнакі і дзяўчаты, зыходзячы з тэмы, акрэсліце адукацыйную мэту ўрока і задачы сваёй дзейнасці на ўроку, які будзе праходзіць у форме педагагічнай майстэрні.

*Вучні вызначаюць адукацыйную мэту ўрока:* Асэнсаваць ідэйна-мастацкі змест кнігі Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”.

*Настаўнік прапаноўвае сваю адукацыйную мэту ўрока:* Вызначыць і ўсвядоміць значэнне Чарнобыля ў жыцці, яго ўплыў на свядомасць і мысленне беларусаў праз комплексны літаратурны аналіз кнігі Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”.

- А зараз, юнакі і дзяўчаты, давайце паспрабуем вызначыць, што значыць для вас Чарнобыль.

***IV.* Самаканструкцыя.** *(Гучыць сумная мелодыя.)*

Падабраць асацыятыўныя рады слоў да паняцця “Чарнобыль”. **Вучні робяць**


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

**першы выбар.**

*Хвароба, смерць, аварыя, пажар, маленькія дзеці, сіроты, бальніца, Беларусь, мірны атам, самотны бусел, зона маўчання, малітва, катастрофа, трагедыя, пакуты людзей, радыяцыя, вёска, дапамога, памяць, Чарнобыльскі шлях.*

**V. Сацыяканструкцыя. Знаёмства з рознаўзроўневымі заданнямі.[1]**

**Першы блок пытанняў (2 узровень, 3 – 4 балаў).**

- Якая гістарычная падзея пакладзеная ў аснову сюжэта твора? Знайдзіце адпаведныя радкі і зачытайце.
- Які след пакінула ў вашай памяці кніга Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва?” Чым асабліва запомнілася?
- Зрабіце сціслы пераказ эпізодаў з кнігі Святланы Алексіевіч, якія вельмі ўразілі вас.

**Другі блок пытанняў (3 узровень, 5 – 6 балаў).**

- Падрыхтуйце паведамленне пра Чарнобыльскую аварыю.
- Хто ў спісе ахвяр Чарнобыля стаіць першы? Хто прыняў на свае плечы найбольшы цяжар змагання з гэтай бядой?
- Карыстаючыся Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы вызначце лексічныя значэнні слоў “чарнобыль” і “малітва”.
- Падрыхтуйце паведамленне пра пісьменніцу Святлану Алексіевіч.
- Якія пытанні хвалююць Святлану Алексіевіч у сучасным беларускім жыцці? Сфармулюйце іх на аснове твора “Чарнобыльская малітва”.

**Адказы**

1. Геаграфічнае становішча Беларусі як краіны ў цэнтры Еўропы садзейнічала таму, што на працягу многіх стагоддзяў яна пакутавала амаль ад усіх войнаў, што адбываліся ў рэгіёне. Але колькі б ні гарэлі беларускія гарады і вёскі, як бы ні спустошвалася зямля, яна паднімалася з попелу і дыму і станавілася яшчэ прыгажэйшай.

Аднак бяда, што навалаю хлынула на Беларусь у красавіку 1986 года, аказалася незвычайнай – не было заваёўнікаў, не было баёў, але значная частка тэрыторыі аказалася мёртвай, непрыдатнай для жыцця. Чарнобыльская катастрофа з’яўляецца нацыянальным бедствам для нашай краіны, самай буйнай сусветнай тэхнагеннай катастрофай.

Выкінутае пры выбуху чацвёртага энергаблока АЭС радыеактыўнае рэчыва было зафіксаванае ва ўсіх краінах паўночнага паўшар’я. З агульнай плошчы, забруджанай радыенуклідамі, 70% прыпадае на тэрыторыю Беларусі. Было забруд-

[1] Заданні носяць рознаўзроўневы характар. Але на адно пытанне могуць быць рознаўзроўневыя адказы. Такім чынам мы дасягаем уключэнне ўсіх вучняў у абмеркаванне галоўнай праблемы ўрока, а таксама дасягаем найвышэйшага ўзроўню ў аналітычна-абагульняльнай дзейнасці на ўроку літаратуры. – Заўвага аўтара.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

жана больш за 23% тэрыторыі краіны, дзе пражывала 2 мільёны жыхароў, у тым ліку 500 тысяч дзяцей. Агульнавядома, што ў час Другой сусветнай вайны загінуў кожны трэці беларус, але не ўсе ведаюць, што чарнобыльская трагедыя закранула практычна кожнага жыхара краіны.

Доўга яшчэ трэба будзе даследаваць, які ўплыў аказала выпраменьванне на генетычныя змены, але бясспрэчным з’яўляецца тое, што на Беларусі значна ўзрасла лічба захворванняў на белакроўе і рак шчытападобнай залозы. З’явіліся такія невядомыя да гэтага часу хваробы, як “беларускі букет” – сумесь цукровага дыябету, астмы і алергіі.

Эканамічныя страты, якія панесла Беларусь у выніку Чарнобыльскай катастрофы, перавышаюць 235 мільярдаў долараў ЗША. Штогод Беларусь выдае амаль 10% свайго бюджэту на праграмы, накіраваныя на ліквідацыю наступстваў аварыі.

Вось як гэта адбывалася:

26 красавіка 1986 года, 1:23:00. У чацвёртым энергаблоку ЧАЭС пачынае выпрабоўвацца сістэма аварыйнага ахаладжэння рэактара.

26 красавіка 1986 года, 1:23:40. Аварыйнае адключэнне не спрацоўвае.

26 красавіка 1986 года, 1:23:44. Рэактар выходзіць з-пад кантролю і ўзрываецца. (На той момант у горадзе Прыпяць, што каля 3 кіламетраў ад ЧАЭС, пражывала 45000 чалавек, з іх 16000 дзяцей.)

26 красавіка – 4 траўня 1986 года. Найбольшы выкід радыеактыўнага рэчыва адбываецца на працягу першых 10 сутак. Вецер дзьме ў паўночным і паўночна-ўсходнім напрамках. У канцы красавіка вецер змяняецца на паўднёвы і паўднёва-ўсходні. Месцамі праходзяць моцныя ліўні. У выніку радыеактыўнае забруджанне размяркоўваецца нераўнамерна.

27 красавіка – 5 траўня 1986 года. Здзейснена 1800 вылетаў на верталётах, на полымя рэактара скінута 5000 тон гасільных матэрыялаў (пясок і свінец).

28 красавіка 1986 года, 21:00. ТАСС паведамляе пра тое, што на ЧАЭС адбылася аварыя, у выніку якой пацярпелі людзі. Ствараецца ўрадавая камісія для правядзення даследавання.

29 красавіка 1986 года. Паведамленне пра аварыю ўпершыню перададзена ў навінах па нямецкім тэлебачанні.

Да 5 траўня 1986 года. У першыя дзесяць сутак пасля аварыі з 30-кіламетровай зоны эвакуююцца 130 000 чалавек.

23 траўня 1986 года. Савецкая ўрадавая камісія аддае распараджэнне пра раздачу ёдаўтрымлівальных прэпаратаў. Але згаданая прафілактычная мера з медыцынскага пункту гледжання ўжо не мае сэнсу. За першыя 10 сутак радыеактыўны ёд ужо паспеў адкласціся ў шчытападобных залозах жыхароў забруджаных тэрыторый.

15 лістапада 1986 года. Завершана ўзвядзенне так званага бетоннага саркафага


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

вакол разбуранага рэактара. [2: 66-67]

2. 26 красавіка 1986 года выбухнуў чацвёрты рэактар Чарнобыльскай АЭС.

На Чарнобыльскай АЭС у час аварыі знаходзілася 176 чалавек, але найбольш пацярпелі пажарнікі.

Сярод маладых пажарнікаў вылучаўся сваім аптымізмам лейтэнант Віктар Правік. Яму было ўсяго 24 гады. Ён быў вельмі добры і мяккі чалавек, займаўся творчасцю: пісаў вершы і апавяданні, добра маляваў. У вольны ад працы час захапляўся фатаграфіяй. Загінуў у першыя гадзіны аварыі, мужна і самаадданна выконваючы свой абавязак перад радзімай і сваім народам. Загінулі і многія іншыя пажарнікі, а таксама салдаты, бо ратавалі станцыю, Прыпяць, Чарнобыль, сваю сям'ю, ратавалі ўсіх нас. Але не змаглі сябе захаваць, бо атрымалі вялікую дозу радыяцыі.

Загінулі мірныя людзі, асабліва дзеці, бо не ведалі, што здарылася ў Чарнобылі. Ім ніхто не хацеў казаць праўду. У выніку яны памерлі ад рака шчытападобнай залозы ці вострага лейкозу.

3. У Тлумачальным слоўніку беларускай мовы мы знаходзім наступныя тлумачэнні.

*Чарнобыль.* Шматгадовая травяністая расліна сямейства складанакветкавых з чырванавата-бурым сцяблом; разнавіднасць палыну. (3: 744)

*Малітва.* 1. У веруючых: тэкст, які чытаецца, калі звяртаюцца да бога ці святых. 2. Маленне, звяртанне з просьбай да Бога, святых. (3: 331)

4. Святлана Алексіевіч нарадзілася 31 траўня 1948 года ў горадзе Івана-Франкоўску (Украіна) у сям'і вайскоўца. Бацька – беларус, маці – украінка. Пасля дэмабілізацыі бацькі з арміі сям'я пераехала на яго радзіму – у Беларусь. Жылі ў вёсцы. Бацька і маці працавалі настаўнікамі.

Пасля заканчэння школы працавала карэспандэнтам нараўлянскай раённай газеты (Гомельская вобласць). У 1967 годзе стала студэнткай факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У час вучобы неаднаразова была лаўрэатам рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў навуковых студэнцкіх работ.

Пасля універсітэта Святлану Алексіевіч накіравалі ў бярозаўскую раённую газету (Брэсцкая вобласць). Працуючы ў газеце, адначасова выкладала ў вясковай школе – яшчэ вагалася: ці прадоўжыць сямейную настаўніцкую традыцыю, ці заняцца навуковай дзейнасцю, ці стаць журналісткай? Але праз год яе запрасілі ў рэдакцыю рэспубліканскай “Сельской газеты”. Потым была карэспандэнтам, загадчыкам аддзела нарыса і публіцыстыкі літаратурна-мастацкага часопіса “Нёман”.

Спрабавала сябе ў розных жанрах: пісала рэпартажы, публіцыстыку, апавяданні...

Значны ўплыў на яе выбар зрабіў вядомы беларускі пісьменнік Алесь Адамовіч


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

і яго цудоўныя кнігі “Я – з вогненнай вёскі” і “Блакадная кніга”.

У 1983 годзе была напісана кніга “У вайны не жаночае аблічча”. Два гады яна ляжала ў выдавецтве і не друкавалася, атара кнігі абвінавачвалі ў пацыфізме, у разбурэнні гераічнага вобраза савецкай жанчыны. Такія абвінавачванні ў тыя часы лічыліся сур’ёзнымі.

Але прыйшоў новы час. Пачалася перабудова. У 1985 годзе кніга “У вайны не жаночае аблічча” – раман галасоў (так потым назаве свой твор Святлана Алексіевіч) жанчын-франтавічак пра вайну, якую ніхто не ведаў, пра якую пісьменнікі не расказвалі, выйшла амаль аднача́сова ў часопісе “Октябрь”, беларускім выдавецтве “Мастацкая літаратура”, а затым у выдавецтве “Советский писатель” і г. д.

У 1989 годзе выйшла новая кніга Святланы Алексіевіч “Цынкавыя хлопчыкі” – твор пра злачынную афганскую вайну, якую дзесяць гадоў хавалі ад уласнага народа. Каб напісаць гэтую кнігу, Святлана Алексіевіч чатыры гады ездзіла па краіне, сустракалася з матулямі салдат, якія загінулі, і з былымі воінамі-афганцамі. Сама пабывала ў Афганістане. Пасля выхаду кнігі, якая выклікала ў грамадстве небывалае ўзрушэнне, многія не даравалі аўтару развянчання гераічнага ваеннага міфа. На яе абрынуліся перш за усё ваенныя і камуністычныя газеты. У 1992 годзе ў Мінску быў арганізаваны палітычны суд над аўтарам і кнігай “Цынкавыя хлопчыкі”. Але ў абарону ўзнялася дэмакратычная грамадскасць, многія вядомыя інтэлектуалы за мяжой. Суд быў прыпынены.

У 1993 годзе выйшла новая кніга Святланы Алексіевіч “Зачараваныя смерцю”. Гэта быў расказ пра самагубцаў – пра тых, хто сам пайшоў з жыцця або спрабаваў такое зрабіць, не вытрымаўшы знікнення сацыялістычных ідэй.

У 1997 годзе Святлана Алексіевіч закончыла і апублікавала кнігу “Чарнобыльская малітва” (хроніка прышласці). Яна, як і тры апошнія кнігі, спачатку была апублікавана ў часопісе “Дружба народов”, а потым у выдавецтве “Острожье” (Масква).

Кнігі Святланы Алексіевіч выдаваліся не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой – у ЗША, Германіі, Англіі, Японіі, Швецыі, Францыі, Кітаі, Індыі і інш. Усяго ў дзевятнаццаці краінах свету. Яна – аўтар сцэнарыяў дваццаці аднаго фільма і трох п’ес. Спектаклі па яе кнігах ставіліся ў Францыі, Германіі, Балгарыі. Святлана Алексіевіч узнагароджана многімі міжнароднымі прэміямі, у тым ліку расійскай незалежнай прэміяй “Трыумф”, нямецкай прэміяй “За лепшую палітычную кнігу”.

Зараз пісьменніца збірае матэрыял для кнігі пад назвай “Цудоўны алень вечнага палявання”. Гэта будуць згадкі пра каханне: мужчыны і жанчыны розных пакаленняў расказваюць свае гісторыі. “Мне падумалася, - кажа аўтар, - што я да гэтага часу пісала кнігі пра тое, як людзі забівалі адзін аднаго, як яны паміралі. Але ж гэта не ўсё чалавечае жыццё. Цяпер я напішу, як яны кахалі… Кахаюць… І зноў


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

мае пытанні – хто мы, у якой краіне жывём – пра каханне… Пра тое, дзеля чаго мы, напэўна, і прыходзім на гэты свет. Мне хочацца любіць чалавека. Хоць любіць чалавека цяжка. Усё цяжэй”.

5. Святлану Алексіевіч турбуе ў беларускім грамадстве не толькі экалагічны Чарнобыль, але і духоўны. Пісьменніца занепакоена тым, што сённяшняму чалавеку не хапае духоўнасці, што ён усё часцей забываецца пра свой святы абавязак – быць сапраўдным гаспадаром Зямлі, разумным, чулым, спагадлівым.

Беларусы ўсё часцей адыходзяць ад Бога, ад хрысціянскай маралі. У выніку мы бачым разбураныя сем’і, пакінутых дзяцей, жорсткасць і гвалт, алкагалізм і наркаманію, брыдкаслоўе, нянавісць чалавека да чалавека. Людзьмі не прымаецца вялікія хрысціянскія каштоўнасці – цана чалавечага жыцця, міласэрнасць, дабро, хрысціянская любоў. На першы план прыходзяць матэрыяльныя вартасці жыцця.

**Трэці блок пытанняў (4 узровень, 7 – 8 балаў).**

- Прыгадайце эпізоды, вобразы, пейзажныя замалёўкі, якім надаецца сімвалічнае значэнне. Вызначце ролю гэтых эпізодаў і вобразаў.
- Узгадайце рэальныя гісторыі пакут дзяцей у час чарнобыльскай трагедыі, апісаныя ў кнізе Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”. А каму трэба больш верыць – дарослым ці дзецям? Чаму?
- Ад чаго залежыць далейшае жыццё на Зямлі? Як пазбегнуць экалагічных і звязаных з імі духоўных стратаў?

**Адказы**

1. …Пейзажныя замалёўкі настройваюць чытача на трагічны фінал і развагі пра сэнс жыцця.

2. Дзеці – самыя добрыя і шчырыя стварэнні. Вельмі сумна, што дарослыя знішчаюць у дзяцей усё лепшае, а параджаюць нянавісць, зло, пагарду. Дарослыя адказваюць за тое, што прыручылі. І калі дзеці становяцца агрэсіўнымі, то вінаватыя ў гэтым толькі дарослыя.

3. Далейшае жыццё на Зямлі залежыць ад зменаў у духоўным жыцці грамадства. Чарнобыльская катастрофа не спыніла войнаў, смерцяў і людскіх пакутаў і не спыніць пакуль што, бо любая трагедыя з’яўляецца вынікам духоўнасці чалавека. Толькі праз духоўнае самаўдасканаленне можна выратавацца. Калі кожны наступны дзень будзе новай перамогай над сваімі недахопамі.

У мове пражылося такое выказванне: Чарнобыль экалагічны і духоўны. Я б хацела прывесці прыклады духоўнага Чарнобыля:

Па-першае, гэта наша нерашучасць, пасіўнасць у палітычным жыцці грамадства. “Няхай як ёсць. Абы ціха. А што мы можам зрабіць”. Так думалі і разважалі нашы бацькі, у выніку і адбылася трагедыя – Чарнобыль.

Па-другое, у беларусаў назіраецца ачарсцвенне душы, калі грошы на касметыку, цыгарэты і дыскатэкі знаходзяцца, а дапамагчы роднай маці не хапае ні сродкаў, ні


**Ю. У. Мянькоў,** настаўнік першай катэгорыі Баравабудскага сада-базавай школы Кармянскага раёна

© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

вольнага часу.

Па-трэцяе, безадказнасць, калі чалавек не выконвае свае дадзеныя абяцанні.

Па-чацвёртае, няўменне ці нежаданне бачыць і аналізаваць свае дрэнныя ўчынкі.

Па-пятае, калі ўласная лянота і кволая сіла волі не даюць магчымасці прымусіць сябе зрабіць дамашняе заданне ці дапамагчы роднай маці па дому.

Па-шостае, пагарда і нянавісць да свайго роднага, кроўнага. Пагарда да роднай мовы, гісторыі, традыцый і звычаяў беларускага народа.

Закончыць свой адказ я б хацела вершам Міхася Пазнякова:

Давайце быць дабрэйшымі, о людзі!
Чысцейшымі, святлейшымі штодня,
Дарыць адзін другому ўсмешкі будзем
І пачувацца шчыра, як радня.
Былі і будуць цяжкасці, напасці,
Мы перад вечным часам – каласы.
Знявага, чэрствасць, звады і няшчасці
Хай не заб'юць жыццёвае красы.
У нас ва ўсіх адным-адна дарога…
Дык не забудзем ні на міг аб ёй.
Усе мы ЧАЛАВЕКІ – толькі з Богам,
Усе мы ЛЮДЗІ – толькі з дабрынёй.

Міхась Пазнякоў. Давайце быць дабрэйшымі, о людзі!

**Чацвёрты блок пытанняў (5 узровень, 9 – 10 балаў).**

- Як вы лічыце, ці пачула Маці-Зямля малітву Святланы Алексіевіч? Свой адказ абгрунтуйце. Акрэсліце тэму і ідэю твора Святланы Алексіевіч "Чарнобыльская малітва".
- Падрыхтуйце ілюстрацыю да аднаго эпізодаў твора, адлюстроўваючы назву "Чарнобыльская малітва". Пракаменціруйце малюнак.
- Напішыце сцэнар і прыміце ўдзел у інсцэніраванні эпізоду з твора Святланы Алексіевіч "Чарнобыльская малітва".
- Прачытайце на памяць вершаваныя творы пра Чарнобыль. (Глядзіце дадатак №1.)

Адказы

1. Гэтая кніга не пра Чарнобыль, як піша сама аўтар, а пра свет пасля Чарнобыля. Пра тое, як чалавек жыве, асвойвае новую рэальнасць. Людзі, якія перажылі Чарнобыль, здабываюць сёння новыя веды, змагаюцца з цяжкасцямі жыцця. Але яны ўжо жывуць пасля трэцяй сусветнай вайны… Невыпадкова ў гэтым сэнсе падзагаловак кнігі – хроніка прышласці.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

Што чакае нас усіх у будучыні?.. І тут Святлана Алексіевіч нагадвае беларусам іх памылкі, іх духоўную трагедыю. Трагедыя даўно адбылася, але мы не запомнілі яе ўрокаў. Мы не зразумелі сваіх памылак, і робім усё новыя. Беларусь (і не толькі Беларусь!) знаходзіцца перад мяжой, за якой пануе духоўная смерць. Можа, твор Святланы Алексіевіч з'яўляецца самым песімістычным творам у беларускай літаратуры. Але ён паказвае нам тыя недахопы і хібы ў жыцці сучаснага беларускага грамадства, а таксама паказвае выхад і вызваленне ад грахоў мінулага.

**VI. Сацыялізацыя.[2] Агучванне адказаў. Вучні робяць другі выбар.**

*Пекла, сумленне, Зло, пакаранне, расплата за грахі, знішчэнне, падман, грэхападзенне, кветка смутку, горкі палын, зварот да Бога, барацьба за Волю, жорсткасць, наркаманія, п'янства, нянавісць чалавека да чалавека, забойства, нерашучасць, пасіўнасць беларусаў, здрада роднай мове, пагарда і нянавісць да роднага, лянота, безадказнасць.*

**VII. Адукацыйны і псіхалагічны разрыў. Зварот да эпіграфа ўрока. Вучні робяць трэці, апошні выбар.**

*Дабро, Любоў, цана чалавечага жыцця, Вечнасць, Бог, Шчасце, Маці-Зямля, Пошукі Шчасця і Будучыні, Сумленне, расплата за грахі, пакаянне, Надзея на Выратаванне.*

Настаўнік: Успомнім хвілінай маўчання ўсіх тых, хто загінуў у час аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі: пажарнікаў і салдат. Успомнім усіх тых, хто загінуў пасля Чарнобыля ад хваробаў і душэўных пакутаў. Успомнім усіх тых, хто хацеў любіць, кахаць і жыць для Будучыні, але адышоў ад нас па волі Чарнобыля.

Успомнім жыхароў тых вёсак і мястэчак Беларусі і любімай нашай Кармяншчыны, якія вымушаныя былі пакінуць сваю малую радзіму і пераехаць на чужыну. Мы ўсіх памятаем і любім. Няхай там ім будзе добра, як і на радзіме.

*Удар гонга. Хвіліна маўчання.*

**VIII. Падагульненне. Адзнакі за ўрок. Каментар адзнак.**

**IX. Рэфлексія (Аналіз урока).**

**"Ланцужок пажаданняў":** Кожнаму удзельніку ўрока па ланцужку (у пэўнай паслядоўнасці) прапануецца звярнуцца з пажаданнямі да сябе, сваіх таварышаў, а таксама да Майстра (настаўніка) па выніках урока. Пажаданні могуць накіраваны на будучыя справы.

Заканчваецца ланцужок пажаданняў настаўнікам, які падводзіць вынікі, жадае творчага натхнення, трываласці, каб заўсёды любілі і паважалі сваіх бацькоў, заўсёды вярталіся ў родныя мясціны.

**X. Дамашняе заданне:**

---

[2] У сувязі з недахопам часу на ўроку з пытаннямі сацыяканструкцыі вучні знаёмяцца самастойна, за тыдзень да пачатку педагагічнай майстэрні. Пытанні разбіты на некалькі навучальных блокаў, з рознаўзроўневымі заданнямі. – Заўвага аўтара.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

А). Напісаць сачыненне “Чарнобыль – гэта…”

Б). Напісаць верш ці апавяданне на тэму Чарнобыля. (Заданні на выбар.)

Спіс літаратуры

1. Алексіевіч Святлана. Чарнобыльская малітва: Хроніка прышласці // Полымя, 1998, №4.

2. Лапянок Людміла. Чарнобыль экалагічны і духоўны: Што страшней? (Класная гадзіна) // Роднае слова. 2007. №3. С. 65.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – 4-е выд. – Мінск: БелЭН, 2005 г.

**Вершы пра Чарнобыль (Дадатак №1.)**

Калі б не тая ноч красавіка,
Што горыччу дыхнула неспазнанай,
Як і раней, цякла б між траў рака,
Як і раней, суніцы спелі б на палянах.
Як і дагэтуль, радасць птушанём
Здзіўлёна кроплі ў дзень лавіла б летні
Нябёс лагодных, што вадою гром
Астуджваюць над лугам перагрэтым.
Шукаў бы зноў грыбнік баравіка,
І рыбака б удача не мінала,
Калі б не тая ноч красавіка,
Якой і ў страшным сне зямля не знала.

**Віктар Ярац. “Балада Палесся”**

Мой хворы край,
у чым твая віна,
якіх багоў ты ўвёў у гнеў суровы?
Маўчыць твая (на стронцыі) трава.
Маўчаць твае азёрныя дубровы.
Маўчаць твае сасновыя бары,
што радасцю віталі і дарылі
духмяныя і шчодрыя дары
і спеў галін густых
зялёнакрылы.
Маўчаць твае бярозы і снягі –
яны ні кроплі


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

ў тым не вінаваты,
што воблакі – атрутныя мяхі –
рассыпалі атрутныя зярняты.

**Віктар Ярац. “Мой хворы край…”**

Адвярнуліся іншыя нацыі,
Ці самі – добраахвотна ад іх.
Мы, заложнікі радыяцыі
І эксперыментаў сляпых.

Цішыня над старонкай лясною.
За якія ж грахі гэткі здзек?
Беларусы!
Нас белай крывёю
Пазначае бязлітасны век.

Няўжо мала чырвонай, пякучай
Мы за долю сваю пралілі,
Каб застаўся наш край мілагучны
Белай плямай на грэшнай зямлі?!

Каб жа суджана мне памыліцца…
І на скрутках калючых дратоў
Я гатовы, як грэшнік, маліцца
За здароўе палескіх братоў.

За імшарамі стогне ласіха.
Без нуды замаркоціўся люд.
- Абы ціха, - гучыць, -
Абы ціха…
Па селектарнай сувязі тут.

**Анатоль Грачанікаў. “Адвярнуліся іншыя нацыі…”**

Ах, Чарнобыль…
Чарнобыль…
Чарнобыль!
Неславутая ў свеце АЭС!..
Ты ў свае праглынула вантробы
Нашу вёску, і поле, і лес.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

І здаецца, не атам твой мірны
У глухіх ненажэрных катлах, -
Там гарацць нашы хаты і свірны,
Там гарыць наш палескі абсяг.

Атруціла зямельку і мову,
Долю нашу скруціла ты ў крук.
І расплавіла шчасця падкову,
Што вякамі каваў паляшук.

**Анатоль Грачанікаў. "Ах, Чарнобыль…"**

У час, калі столькі турбот
І гэтулькі рознага ліха,
Прачніся, мой ціхі народ,
І думкі адкінь "абы ціха".

Узніміся, гаротны народ,
Народ, не прадаўшы сумлення,
Супроць апаратных ільгот
І розных пасад прывілейных.

Свой голас падай сёння ты,
Пакуль твая песня не спета,
І супраць прамоўцаў пустых,
І супраць жыцця без прасвету.

Скінь думак чужых з сябе цень,
А май свой уласны лепш розум.
Устань жа нарэшце з калень,
Зрабіся нарэшце цвярозым.

Адрынуўшы безліч турбот
І скінуўшы рабскія робы,
За мёртвых ўзніміся, народ,
За тых, каго знішчыў Чарнобыль.

У імя дзяцей, мацярок
Павінен за праўду ты біцца,



© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

Каб болей чарнобыльскі ўрок
Ніколі не змог паўтарыцца.

**Анатоль Зэкаў. "Прачніся, народ!"**

Агонь, радыяцыя люта звярэлі,
Кіпелі графіт і смала,
Не грэшнікі,
слаўныя хлопцы гарэлі…
І зона маўчання была.

Адлік пачынаўся нязнанае эры
Змагання жыцця з небыццём.
І грукаўся,
грукаўся кожнаму ў дзверы
Чацвёртага блока разлом.
Скакалі і ў Швецыі стрэлкі прыбораў,
Еўропу трывогу гняла.
Зашкальвала ўсё чалавечае гора…
І зона маўчання была.

Пляваўся атрутнаю параю кратэр,
Злавесныя хмары плылі.
А людзі ў Нароўлі
да майскага свята
Двары, тратуары мялі.

У вёсках гароды рабілі жанчыны,
Чаромха буяла, цвіла…
Кацілі ад Кіева прэч лімузіны…
І зона маўчання была.

Паўзлі між людзей нечуваныя чуткі,
І пухла ад іх галава.
Глядзелі з надзеяй на радыё: "Хутка
Усё растлумачыць Масква".

Ішлі піянеры ў святочных калонах,
Звінела парадная медзь.
Стаялі ў чаканні нямым эшалоны:


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

“Як грымне,
ці зможам паспець?..”

А мне і цяпер не хапае азону,
Не выбрацца з даўкага тхла…
Яшчэ не было адгароджанай зоны,
А зона маўчання была.

**Сяргей Законнікаў. “Чорная быль”**

Ты вяскуй, Беларусь,
Ты вяскуй –
Край дубровы, бусловы,
Шпачыны…
Толькі б кожны
У тваім каласку
Прызнаваў за табою
Айчыну.

Ты дазволь, Беларусь,
Ты дазволь:
Хай стагоддзяў
Зайграюць арганы,
Каб нашчадкам
Не чуўся наш боль,
Што сціскае за горла
Арканна…
………………….
Ты распрам, Беларусь,
Ты распрам,
За гады
Прыгарбелыя плечы…
Дай званы
Ты сваім званарам
І пакліч нас
На веча, на веча,
На веча…

**Віктар Стрыжак. “Беларусі”**


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf

Памірала дзяўчынка ў бальніцы,
А дыягназ-прысуд – белакроўе.
Не было на зямлі чараўніцы,
Каб змагла падарыць ёй здароўе.

У бялюткай, як саван, палаце
Высыхала, як кветка, малая.
І бяссільныя бацька і маці:
- Памірае дачка. Памірае!

І самотная гэта палата
Калыхала бяссонныя ночы.
На абходзе ўрач вінавата
Пазіраў у дзіцячыя вочы.

У вачах столькі суму і болі,
Як вады ў глыбокіх азёрах!
Ёй ніколі, ёй болей ніколі
Не гуляць па зялёных прасторах.

Адзвінела духмянае лета,
У пшанічных снапах дагарала.
А дзяўчынка, як кветка з букета,
У бальнічных сцянах памірала.

Белым снегам бялела палата,
І нямелі дзіцячыя мары.
Чалавецтва ўсё вінавата
За атруту чарнобыльскай хмары.

Чорны крыж, чорны след – з Хірасімы
Па зямлі нашай доўжыцца вужам,
Пагражаюць атрутныя зімы
Нашым марам, надзеям і душам.

**Г. Шчур, жыхарка Беразіно**


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/myankou.pdf